## Уводзіны

ПРАМЫСЛОВАЯ РЭВАЛЮЦЫЯ
НАВУКОВА-ТЭХНІЧНАЯ РЭВАЛЮЦЫЯ
УРБАНІЗАЦЫЯ МАСАВАЯ КУЛЬТУРА
РЭВАЛЮЦЫЯ «ХАЛОДНАЯ ВАЙНА»
ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫЯ
ПОСТІНДУСТРЫЯЛЬНАЕ ГРАМАДСТВА
ГЛАБАЛІЗАЦЫЯ ПЕРШАЯ СУСВЕТНАЯ ВАЙНА ДРУГАЯ СУСВЕТНАЯ ВАЙНА

## *Уводзіны

**1. Гісторыя і сучаснасць.** Гісторыя і сучаснасць непарыўна звязаныя паміж сабой. Кожнае пакаленне звяртаецца да мінулага, каб зразумець прычыны падзей, што адбываюцца, і знайсці арыенціры для будучыні. У гэтым сэнсе гісторыя выступае не толькі як сховішча фактаў, але і як найважнейшы інструмент асэнсавання сучаснага свету.

Сусветная гісторыя XIX — пачатку XXI ст. паказвае, што лёсы асобных краін і народаў заўсёды развіваліся ў шчыльнай узаемасувязі з глабальнымі працэсамі. Індустрыялізацыя і навукова-тэхнічны прагрэс, рэвалюцыі і рэформы, сусветныя войны і распад імперый, станаўленне нацыянальных дзяржаў і працэсы глабалізацыі — усё гэта складала адзінае гістарычнае поле, у межах якога фарміраваліся і сучасныя грамадствы.

**Адзінае гістарычнае поле**

Прывядзіце прыклады ўзаемасувязі гісторыі асобных краін з глабальнымі працэсамі.

**XIX ст.**

У XIX ст. найважнейшымі тэндэнцыямі выступілі пашырэнне ідэй свабоды і нацыянальнага самавызначэння, развіццё прамысловасці і рост гарадоў, з'яўленне новых сацыяльных рухаў. Гэтыя працэсы вялі да змянення звыклых формаў жыцця, фарміравання палітычных нацый і росту міжнароднай канкурэнцыі. Беларусь, якая знаходзілася ў складзе Расійскай імперыі, падзяляла многія з гэтых тэндэнцый: адмена прыгоннага права, першыя крокі індустрыялізацыі, абуджэнне нацыянальнай самасвядомасці былі часткай больш шырокіх змен, што ахапілі Еўропу.

Успомніце дату адмены прыгоннага права на тэрыторыі Беларусі.

**XX ст.**

XX ст. сталася часам глабальных зрушэнняў і імклівых перамен. Дзве сусветныя вайны не толькі змянілі палітычную карту свету, але і паказалі, наколькі шчыльна ўзаемазвязаныя лёсы дзяржаў і народаў. Беларусь апынулася ў самым эпіцэнтры гэтых падзей: Першая сусветная вайна, рэвалюцыі 1917 г., утварэнне БССР, падзел тэрыторыі паміж Польшчай і Савецкай Расіяй, а пасля трагічныя выпрабаванні Вялікай Айчыннай вайны былі неад'емнай часткай агульнаеўрапей-

скай і сусветнай гісторыі. Страты беларускага народа ў гады вайны, масавае супраціўленне акупацыі і наступнае аднаўленне краіны адлюстравалі і агульны кошт, які чалавецтва заплаціла за перамогу над нацызмам.

Пасляваенны свет фарміраваўся ва ўмовах «халоднай вайны», супрацьстаяння дзвюх сістэм і адначасова — навукова-тэхнічнай рэвалюцыі, якая змяніла паўсядзённае жыццё людзей. Беларусь як саюзная рэспубліка СССР удзельнічала ў гэтых працэсах: развіццё прамысловасці, навукі, адукацыі і культуры зрабіла яе часткай сусветных мадэрнізацыйных тэндэнцый. Адначасова крызіс савецкай сістэмы напрыканцы XX ст. стаў адлюстраваннем глабальнага пералому, які прывёў да распаду СССР і ўтварэння новых незалежных дзяржаў.

**Канец XX — пачатак XIX ст.**

Канец XX — пачатак XXI ст. адкрылі новы этап сусветнай гісторыі — эпоху глабалізацыі, інфармацыйных тэхналогій, імклівых міжнародных кантактаў і адначасова новых выклікаў: эканамічных крызісаў, рэгіянальных канфліктаў, праблем экалогіі і бяспекі. Беларусь, якая зрабілася незалежнай у 1991 г., уцягнулася ў гэты працэс як паўнапраўны суб'ект міжнародных адносін, выбудоўвала сваё месца ў зменлівым свеце.

Сувязь гісторыі і сучаснасці праяўляецца і ў грамадскай памяці. Вялікая Айчынная вайна, нацыянальныя рухі XIX ст., савецкі досвед і дасягненні незалежнай Беларусі працягваюць уплываць на самаадчуванне народа. Гістарычны вопыт дапамагае зразумець, што сучаснасць заўсёды вырастае з мінуўшчыны, а выбар будучыні немагчымы без асэнсавання пройдзенага шляху. Памяць пра мінулае фарміруе грамадзянскую пазіцыю, дапамагае асэнсаваць месца Беларусі ў сусветнай гісторыі і вызначыць шляхі яе будучага развіцця.

Такім чынам, гісторыя і сучаснасць — гэта адзіны працэс, у якім лёсы народаў зніттаваныя з глабальнымі тэндэнцыямі. Вывучаючы сусветную гісторыю XIX–XXI стст., мы бачым, што і Беларусь, і іншыя краіны

зазналі агульныя выклікі — войны і рэвалюцыі, мадэрнізацыю і інтэграцыю, пошукі нацыянальнай ідэнтычнасці. Асэнсаванне гэтай узаемасувязі дае магчымасць глыбей зразумець сучасны свет і сваё месца ў ім.

Метад перыядызацыі

**2. Гістарычная перыядызацыя.** Гісторыя чалавецтва разгортваецца як непарыўны працэс, аднак для яе вывучэння і разумення вучоныя карыстаюцца *метадам перыядызацыі* — падзелам гістарычнага шляху на асобныя этапы. Перыядызацыя дазваляе ўпарадкаваць факты, выявіць заканамернасці, супаставіць падзеі ў розных краінах і рэгіёнах, а таксама прасачыць, як змянялася грамадства пад уплывам эканамічных, палітычных і культурных фактараў. Без перыядызацыі гісторыя выглядала б як набор разрозненых фактаў, а на самай справе яна ўяўляе сабой цэласны працэс.

Кожная эпоха мае свае адметнасці, і таму гісторыкі абапіраюцца на ключавыя падзеі і працэсы, каб вылучыць яе межы. Існуюць розныя віды перыядызацыі: сусветная, рэгіянальная, нацыянальная. Сусветная гісторыя звычайна падзяляецца на Старажытны свет, Сярэднявечча, Новы і Навейшы час. Пры гэтым гісторыя асобных краін можа мець свае асаблівасці падзелу, звязаныя з нацыянальнай спецыфікай. Для Беларусі перыядызацыя шчыльна звязаная як з агульнаеўрапейскімі працэсамі, так і з гісторыяй Усходняй Еўропы, савецкай і постсавецкай прасторы.

Як вы разумееце значэнне тэрмінаў «рэгіянальная гістарычная перыядызацыя» і «нацыянальная гістарычная перыядызацыя»?

Значэнне перыядызацыі

У школьным курсе гісторыі перыядызацыя важная з дзвюх прычын. Па-першае, яна дапамагае сістэматызаваць вучэбны матэрыял, злучае асобныя падзеі ў адзіную лінію. Па-другое, яна паказвае, што гісторыя Беларусі заўсёды была часткай сусветнага гістарычнага працэсу: рэформы XIX ст. адбываліся адначасова з мадэрнізацыяй Еўропы, рэвалюцыі і войны пачатку XX ст. былі часткай глабальных канфліктаў, а распад СССР і станаўленне незалежнай Беларусі ўпісваюцца ў шырэйшы кантэкст канца «ха-

лоднай вайны» і фарміравання новай сістэмы міжнародных адносін.

## Этапы перыяду XIX — першай чвэрці XXI ст.

У межах дадзенага вучэбнага дапаможніка разглядаецца перыяд з XIX ст. да першай чвэрці XXI ст. Гэты адрэзак уключае некалькі буйны́х этапаў.

| Этапы | Асноўны змест | Працэсы на тэрыторыі Беларусі |
|---|---|---|
| XIX ст. | Час сацыяльна-эканамічных рэформаў, выкліканых агульнаеўрапейскай і расійскай мадэрнізацыяй | Адмена прыгоннага права, развіццё прамысловасці і гарадоў, зараджэнне нацыянальна-культурнага руху заклалі аснову для фарміравання беларускай нацыянальнай ідэнтычнасці |
| Пачатак XX ст. і міжваеннага перыяду | Першая сусветная вайна, рэвалюцыі 1917 г., міжнародныя дамовы, што змянілі палітычную карту Еўропы | Гады войнаў і рэвалюцый, станаўленне беларускай дзяржаўнасці, захоп часткі тэрыторыі Беларусі Польшчай |
| Савецкі перыяд (1917–1980-я гг.) | Час маштабных пераўтварэнняў, вядомых як савецкая мадэрнізацыя | Індустрыялізацыя, калектывізацыя, развіццё адукацыі і навукі змянілі сацыяльнае аблічча краіны. Вялікая Айчынная вайна стала найвялікшым выпрабаваннем, падчас якога Беларусь страціла траціну насельніцтва, але праявіла масавы гераізм. Пасляваеннае аднаўленне і далейшае развіццё забяспечылі высокі ўзровень індустрыялізацыі і культуры |
| Канец XX ст. | Крызіс савецкай сістэмы | Набыццё Беларуссю незалежнасці ў 1991 г. Пераход да рыначных адносін, фарміраванне інстытутаў нацыянальнай дзяржаўнасці, пошук месца ў сістэме міжнародных сувязей |
| Першая чвэрць XXI ст. | Сучасны этап развіцця, які характарызуецца ўмацаваннем суверэнітэту, удзелам у інтэграцыйных працэсах, адаптацыяй да выклікаў глабалізацыі | Беларусь захоўвае сваю гістарычную традыцыю, адначасова вырашае задачы мадэрнізацыі і супрацоўніцтва ў сусветнай супольнасці |

Прывядзіце прыклады асноўных гістарычных падзей, з'яў, працэсаў кожнага этапу XIX — першай чвэрці XXI ст.

Такім чынам, перыядызацыя не з'яўляецца фармальным падзелам гістарычнага часу, а служыць важным інструментам асэнсавання мінулага. Яна дазваляе пабачыць унутраную логіку гістарычнага працэсу, зразумець, як падзеі сусветнай гісторыі адбіваліся на лёсе Беларусі, якія фактары вызначалі яе развіццё і якім чынам яны ўплываюць на нашу сучаснасць і будучыню.

**3. Перыядызацыя сусветнай гісторыі і гісторыі Беларусі XIX — першай чвэрці XXI ст.** Перыяд гісторыі, што будзе вывучацца ў 11 класе, ахоплівае больш за два стагоддзі — ад пачатку XIX ст. да нашых дзён. У адпаведнасці з агульнапрынятай перыядызацыяй эпоху XIX — пачатку XX ст. адносяць да заключнага этапу Новага часу, пачатак якога сягае ў апошнія дзесяцігоддзі XV ст. Першая сусветная вайна, што падзяліла перыяды Новай і *Навейшай гісторыі*, пацягнула за сабой шэраг падзей і з'яў, якія вызначылі асаблівасці XX ст.

Як вы лічыце, якія асаблівасці XX ст. дазваляюць вылучыць у перыядызацыі сусветнай гісторыі Навейшы час?

У аснову гістарычнай перыядызацыі пакладзены найбольш істотныя фактары, якія з'яўляюцца агульнымі для ўсіх краін, вызначаюць вектар гістарычнага развіцця. Фактары могуць быць розныя: эканамічныя і палітычныя, матэрыяльныя і духоўныя. Таму і існуе мноства перыядызацый і падыходаў да вывучэння як сусветнай гісторыі, так і гісторыі асобнай краіны.

Перыядызацыя сусветнай гісторыі

Найбольш вядомай з'яўляецца перыядызацыя, паводле якой сусветная гісторыя падзяляецца на 5 перыядаў.




Успомніце:
1. Храналагічныя рамкі кожнага перыяду сусветнай гісторыі.
2. Падзеі, што адбываліся падчас пераходу чалавецтва з аднаго гістарычнага перыяду ў іншы.

**Перыядызацыя гісторыі Беларусі**

Гісторыя Беларусі арганічна ўпісваецца ў гэтую перыядызацыю. Усе тэндэнцыі агульнагістарычнага развіцця ўласцівыя і нашай краіне. Аднак перыядызацыя гісторыі асобных краін і народаў далёка не заўсёды цалкам супадае з сусветнай, бо кожная краіна мае ўласны, непаўторны шлях гістарычнага развіцця.

Ёсць усе падставы сцвярджаць, што гэта адносіцца і да Беларусі. Галоўнай гістарычнай каштоўнасцю для нас выступае факт захавання беларускага этнасу і развіцця беларускай дзяржаўнасці. Таму за аснову перыядызацыі айчыннай гісторыі можна ўзяць *гістарычныя і нацыянальныя формы беларускай дзяржаўнасці*.

**Гістарычныя формы беларускай дзяржаўнасці**

Да гістарычных формаў дзяржаўнасці, што існавалі на тэрыторыі Беларусі, адносяцца Старажытнаруская дзяржава, Полацкае і Тураўскае княствы, Вялікае Княства Літоўскае, Рускае і Жамойцкае, Расійская імперыя. Усе пералічаныя дзяржаўныя ўтварэнні былі агульныя не толькі для беларусаў, але і для іншых народаў.

**Нацыянальныя формы беларускай дзяржаўнасці**

Нацыянальныя формы беларускай дзяржаўнасці найбольш яскрава ўвасоблены ў Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспубліцы (БССР) і Рэспубліцы Беларусь.



*Полацкая, Тураўская і іншыя землі. Старажытнаруская дзяржава*



*Вялікае Княства Літоўскае*



*Расійская імперыя*



*БССР*



*Рэспубліка Беларусь*

Якія помнікі архітэктуры паказаныя на ілюстрацыі да кожнага перыяду? Успомніце храналагічныя рамкі кожнага перыяду гісторыі Беларусі.

**Беларусь у складзе Расійскай імперыі**

Апошнія тры перыяды з вышэйзгаданых з'яўляюцца вызначальнымі для беларускага народа. Сваім зместам яны ўпісваюцца ў другі этап Новага і ўсяго Навейшага часу, якія будуць вывучацца ў 11 класе.

Перыяд у складзе Расійскай імперыі храналагічна ахоплівае канец XVIII — пачатак XX ст. У сусветнай гісторыі гэта адпавядае XIX ст. Пануючае становішча ў свеце займалі імперыі. Аднак у выніку Першай сусветнай вайны Германская, Расійская, Аўстра-Венгерская і Асманская імперыі распаліся.

**Асноўны змест гісторыі XIX ст.:**
- прамысловая рэвалюцыя;
- фарміраванне індустрыяльнага грамадства;
- рэформы і рэвалюцыі;
- каланіяльная экспансія еўрапейскіх дзяржаў;
- пераход капіталізму ў яго імперыялістычную стадыю.

**Свет і Беларусь у Навейшы час**

Існаванне беларускай дзяржаўнасці ў форме БССР у Рэспубліцы Беларусь суадносіцца з перыядам

гісторыі Навейшага часу. Асноўны змест гэтага этапу складаюць завяршэнне фарміравання *індустрыяльнага грамадства* і пачатак пераходу да постіндустрыяльнага.

*Постіндустрыяльнае грамадства* — гэта стадыя ў развіцці грамадства, якая пачалася прыблізна ў апошняй чвэрці XX ст. як вынік навукова-тэхнічнай рэвалюцыі. Да пачатку XXI ст. у постіндустрыяльную стадыю развіцця ўступілі каля 30 дзяржаў, у якіх жыве пятая частка насельніцтва планеты.

У гісторыі Навейшага часу можна вылучыць тры адносна самастойныя перыяды.

**Асноўныя рысы індустрыяльнага грамадства:**
- масавая вытворчасць тавараў;
- машынізацыя і аўтаматызацыя вытворчасці;
- узрастанне ролі дзяржавы ў рэгуляванні сацыяльна-эканамічнай сферы;
- рост колькасці рабочага класа, яго барацьба за свае правы;
- урбанізацыя;
- разбурэнне саслоўных прывілей;
- фарміраванне масавай культуры.

**Асноўныя рысы постіндустрыяльнага грамадства:**
- развіццё энергазберагальных тэхналогій;
- стварэнне высокатэхналагічных вытворчасцей;
- усеагульная інфарматызацыя;
- развіццё навукі і тэхнікі;
- павышэнне ўзроўню адукацыі, медыцыны, якасці жыцця людзей;
- пераарыентацыя эканомікі з прамысловай вытворчасці ў бок развіцця сферы паслуг.

| | |
|---|---|
| 1918–1939 гг. | • Барацьба дэмакратычнай і таталітарнай тэндэнцый у Еўропе. Развіццё нацыянальна-вызваленчага руху ў Азіі;<br>• абвастрэнне супярэчнасцей паміж найбуйнейшымі дзяржавамі свету |
| 1939–1945 гг. | Барацьба дзяржаў антыгітлераўскай кааліцыі супраць фашысцкіх дзяржаў і іх саюзнікаў. Найважнейшай яе часткай была Вялікая Айчынная вайна, перамога савецкага народа ў якой забяспечыла разгром нацызму |
| 1945 г. — цяперашні час | • Спаборніцтва дзвюх звышдзяржаў — СССР і ЗША, капіталістычных і сацыялістычных краін;<br>• распад СССР і біпалярнага светапарадку, дамінаванне ЗША;<br>• глабалізацыя, фарміраванне шматпалярнага свету, рост уплыву Кітая і Расіі |

Як вы лічыце, ці можна ў наш час казаць пра фарміраванне чацвёртага перыяду Навейшага часу? Сваю думку аргументуйце.

**4. Асноўныя тэндэнцыі развіцця свету ў XIX — першай чвэрці XXI ст.** У XIX ст. у вядучых краінах свету склаўся новы тып індустрыяльнай цывілізацыі, які на доўгі час вызначыў кірунак развіцця сусветнай гісторыі. Пашырэнне капіталізму суправаджалася актыўнай каланіяльнай экспансіяй еўрапейскіх дзяржаў, што ўзмацняла ўплыў Захаду на іншыя рэгіёны. Заходняя цывілізацыя аказвала ўсё большы ўплыў на свет, фарміруючы глабальныя эканамічныя, палітычныя і культурныя сувязі. Упершыню ў гісторыі адна група краін усталявала панаванне над большасцю рэгіёнаў планеты. Развіццё дзяржаў і народаў набывала падобныя рысы, што закладвала падмурак для будучай **глабалізацыі**, у якой прамысловая вытворчасць, гандаль і культурныя працэсы рабіліся ўсё больш узаемазвязанымі.

Пачатак індустрыяльнай цывілізацыі

**Глабалізацыя** — працэс усебаковага збліжэння розных краін і станаўлення адзінай сістэмы тэхналагічных, фінансавых, эканамічных, сацыяльна-палітычных і культурных сувязей на аснове найноўшых інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій.

На мяжы XIX–XX стст. развітыя краіны свету ўвайшлі ў эпоху імперыялізму. Адначасова з гэтым захавалася і нават узмацнілася нераўнамернасць развіцця асобных дзяржаў. Такія краіны з розным гістарычным мінулым, як, напрыклад, Германія і Японія, развіваліся хуткімі тэмпамі і імкнуліся да новага перадзелу свету. Ваяўнічы нацыяналізм і імперскія амбіцыі, гонка ўзбраенняў і сістэма вайскова-палітычных саюзаў, што супрацьстаялі адзін аднаму, зрабілі сваю разбуральную справу. Рост міжнароднай напружанасці, што прыкметна выявіўся напачатку XX ст., у выніку прывёў да Першай сусветнай вайны 1914–1918 гг. Яна паўстала пачаткам эпохі рэвалюцый і грамадзянскіх войнаў.

Свет у першай палове XX ст.

Першая палова XX ст. адзначылася бурным індустрыяльным развіццём. Вырашальную ролю ў эканоміцы цяпер адыгрывалі новыя тэхналогіі. Паскарэнне тэмпаў развіцця шмат у чым было абумоўлена навукова-тэхнічным «выбухам» канца XIX — пачатку XX ст.

Пасляваеннае развіццё краін Захаду прывяло да сусветнага эканамічнага крызісу, што пачаўся

ў 1929 г., а гэта ў значнай меры справакавала развіццё міжнароднага палітычнага крызісу, які прывёў да Другой сусветнай вайны. Яшчэ адна праблема, з якой сутыкнуліся на Захадзе, — гэта прыход да ўлады ў асобных еўрапейскіх краінах перш за ўсё фашыстаў Італіі і нацыстаў Германіі.

Успомніце прыкметы капіталістычнага грамадства.

Капіталістычнаму варыянту развіцця Захаду ў гэты час супрацьстаяла савецкая мадэль мадэрнізацыі. Сацыялістычныя пераўтварэнні, індустрыялізацыя і калектывізацыя дазволілі СССР выйсці на адзін узровень развіцця з краінамі, што займалі пануючае месца ў сусветнай эканоміцы, і перамагчы ў самай крывавай вайне супраць гітлераўскай Германіі і яе саюзнікаў.

XX ст. характарызуецца надзвычайным паскарэннем тэмпаў сацыяльна-палітычных змен. Чарада сацыяльных рэвалюцый, асаблівае месца сярод якіх займае Кастрычніцкая рэвалюцыя ў Расіі, не раз скаланала краіны і кантыненты. Вырашальны ўплыў

## ПРАЦУЕМ З ГІСТАРЫЧНАЙ КРЫНІЦАЙ







Якія падзеі і тэндэнцыі Навейшага часу ілюструюць гэтыя плакаты, выпушчаныя ў СССР у другой палове XX ст.?

на лёс усяго чалавецтва аказала перамога СССР і краін антыгітлераўскай кааліцыі над нацысцкай Германіяй і яе саюзнікамі ў гады Другой сусветнай вайны.

Уплывовай сілай сучаснасці выступіў нацыянальна-вызваленчы рух народаў Азіі і Афрыкі. У выніку *дэкаланізацыі* на палітычнай карце свету з'явілася больш за 100 незалежных дзяржаў.

Свет у перыяд «халоднай вайны»

Пасля завяршэння Другой сусветнай вайны вядучую ролю ў свеце пачалі адыгрываць дзве звышдзяржавы — СССР і ЗША. Сфарміравалася Ялцінска-Патсдамская сістэма міжнародных адносін. Яна характарызавалася падзелам сусветнай супольнасці на дзве варожыя паміж сабой грамадска-палітычныя сістэмы — капіталістычную і сацыялістычную. Супрацьстаянне і канфлікты паміж імі ўвайшлі ў гісторыю пад назвай *«халоднай вайны»*.

У гэтым супрацьстаянні ЗША наблізіліся да палітычнай і эканамічнай гегемоніі, маючы дамінуючыя пазіцыі ў сусветнай гаспадарцы і кантралюючы сусветную фінансавую сістэму, а таксама забяспечыўшы сабе паступлення нафты з Блізкага Усходу. У 1991 г. «халодная вайна» скончылася разам са спыненнем існавання Савецкага Саюза.

Свет у канцы XX — першай чвэрці XXI ст.

Распад СССР і ўсяго сацыялістычнага лагера прывёў да істотных змен ва ўсім свеце. Паўстала новая структура эканамічных і палітычных адносін паміж вялікімі дзяржавамі, скончыўся перыяд біпалярнага светапарадку. На перадавыя пазіцыі ў сусветнай эканоміцы і палітыцы выйшлі ЗША. Бескантрольнае пашырэнне НАТО на ўсход ператварылася ў сур'ёзную небяспеку для Расійскай Федэрацыі. У адказ Масква актывізавала намаганні па абароне свайго суверэнітэту і незалежнасці, што прывяло да абвастрэння адносін Расіі з Захадам і яго саюзнікамі.

Апошнім часам сталі асабліва заўважныя прыкметы страты ЗША пануючага становішча ў свеце, тады як Кітайская Народная Рэспубліка (КНР) пасту-



Панарама Пекіна

Якая на цяперашні час роля Кітая ў сусветнай эканамічнай сістэме?




Прывядзіце прыклады дружбы і супрацоўніцтва, яднання братэрскіх народаў Беларусі і Расіі ў гады ваенных выпрабаванняў і мірнага будаўніцтва.

пова ператварылася ў «сусветную фабрыку», высокатэхналагічную краіну і пануючую кантынентальную дзяржаву Усходняй Азіі.

**5. Асаблівасці гістарычнага развіцця Беларусі ў XIX — першай чвэрці XXI ст.** Лёсавызначальнай падзеяй для беларусаў было далучэнне тэрыторыі Беларусі да Расійскай імперыі ў выніку трох падзелаў Рэчы Паспалітай напрыканцы XVIII ст. Фактычна адбылося ўз'яднанне ўсходнеславянскіх народаў у адной дзяржаве. Пачалося азнаямленне беларусаў з багатай рускай культурай, але галоўнае — быў спынены працэс паланізацыі беларускага народа. У гэтым заключаецца гістарычнае значэнне падзелаў Рэчы Паспалітай для беларусаў.

Па меры развіцця беларускага этнасу ў складзе Расійскай імперыі ўзніклі ўмовы для стварэння ўласнай дзяржаўнасці. Беларускі нацыянальны рух аформіўся ў канцы XIX — пачатку XX ст. Спачатку ён выступаў за развіццё беларускай культуры і мовы, а пасля за стварэнне дзяржавы на нацыянальнай аснове. Такі позні выхад нацыянальнага руху на арэну грамадска-палітычнага жыцця тлумачыцца складанымі ўмовамі гістарычнага развіцця ў папярэдні перыяд. Цяжкасць становішча, у якім апынуўся беларускі народ пасля далучэння да Расійскай імперыі, заключалася ў тым, што ён не меў сваёй эліты, інтэлігенцыі, літаратурнай мовы, школ і г. д. У значнай ступені беларуская шляхта на той час была ўжо апалячаная. Эканамічна актыўным насельніцтвам беларускіх гарадоў былі пераважна прадстаўнікі яўрэйскай буржуазіі, якія адстойвалі свае нацыянальныя інтарэсы. Таму спатрэбілася нямала часу для таго, каб у беларусаў, небагатай шляхты і сялян, з'явілася ўласная інтэлігенцыя як выразнік нацыянальных інтарэсаў народа.

Рэвалюцыйныя падзеі ў Расіі дазволілі рэалізавацца нацыянальным памкненням беларускага

народа. Кастрычніцкая рэвалюцыя прывяла да ўтварэння Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусі (ССРБ) — першай формы беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці, што паўстала на савецкай аснове. Невыпадкова дзень 7 лістапада з'яўляецца агульнарэспубліканскім святочным днём у Рэспубліцы Беларусь. За гады савецкай улады ў складзе СССР Беларусь ператварылася ў высокаразвітую індустрыяльную дзяржаву, адыграла важную ролю ў барацьбе супраць нацысцкай Германіі і яе саюзнікаў у гады Вялікай Айчыннай вайны.

**ССРБ — першая форма нацыянальнай беларускай дзяржаўнасці**

Пасля распаду Савецкага Саюза БССР была пераўтворана ў суверэнную Рэспубліку Беларусь, якая стала новай нацыянальнай формай беларускай дзяржаўнасці. Наша краіна развіваецца на аснове спадчыны савецкай Беларусі і ў саюзных адносінах з Расійскай Федэрацыяй.

**Рэспубліка Беларусь у сучасным свеце**

### ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ

Дзяржаўныя святы і святочныя дні ў Рэспубліцы Беларусь:

- Дзень Канстытуцыі — 15 сакавіка;
- Дзень яднання народаў Беларусі і Расіі — 2 красавіка;
- Дзень Перамогі — 9 мая;
- Дзень Дзяржаўнага сцяга, Дзяржаўнага герба і Дзяржаўнага гімна Рэспублікі Беларусь — другая нядзеля мая;
- Дзень Незалежнасці Рэспублікі Беларусь (Дзень Рэспублікі) — 3 ліпеня;
- Дзень народнага адзінства — 17 верасня;
- Дзень Кастрычніцкай рэвалюцыі — 7 лістапада.

*Як дзяржаўныя святы Рэспублікі Беларусь адлюстроўваюць гістарычны шлях і каштоўнасці беларускага народа?*

Дзякуючы палітычнай волі кіраўніцтва дзяржавы, што прадстаўляе інтарэсы беларускага народа, наша краіна захавала асноўныя сацыяльныя, эканамічныя і культурныя заваёвы савецкага перыяду, паспяхова супрацьстаіць выклікам часу.

### Што вывучае геапалітыка?

**6. Асноўныя геапалітычныя працэсы ў свеце ў XIX — першай чвэрці XXI ст.** *Геапалітыка* вывучае ўплыў геаграфічнага становішча, рэсурсаў і прасторавых фактараў на міжнародныя адносіны і сусветную палітыку. Для разумення гісторыі XIX– геапалітычныя працэсы, якія вызначалі лёсы народаў і дзяржаў, а таксама месца Беларусі ў сістэме міжнародных сувязей.

### XIX ст.: фарміраванне новай сістэмы міжнародных адносін

Пасля напалеонаўскіх войнаў 1815 г. у Еўропе зацвердзіўся так званы *Венскі парадак*, заснаваны на прынцыпах «Свяшчэннага саюзу». Галоўнай задачай было захаваць стабільнасць і прадухіліць рэвалюцыі. Аднак развіццё нацыянальных рухаў і прамысловая рэвалюцыя паступова змянілі расстаноўку сіл. У Еўропе ўзмацніліся Германія і Італія, узніклі новыя цэнтры прыцягнення, актывізавалася каланіяльная экспансія: Вялікабрытанія, Францыя, Расія, пазней Германія і ЗША змагаліся за калоніі ў Азіі і Афрыцы. Канкурэнцыя паміж дзяржавамі прадвызначыла міжнародныя канфлікты канца XIX ст.




*Заключэнне Свяшчэннага саюзу паміж Расіяй, Прусіяй і Аўстрыяй 26 верасня 1815 г.*
*Літаграфія. Іаган Карл Бок*

Пачатак XX ст.: Першая сусветная вайна і перагляд межаў

XX ст. адкрыла барацьба за ўплыў у свеце. Каланіяльныя супярэчнасці і ваенна-палітычныя саюзы прывялі да Першай сусветнай вайны (1914–1918), якая была першай глабальнай вайной у гісторыі чалавецтва. Яе вынікам стала разбурэнне імперый (Расійскай, Аўстра-Венгерскай, Асманскай, Германскай) і з'яўленне новых незалежных дзяржаў. У 1919 г. Версальская сістэма ўсталявала новы баланс сіл, але не вырашыла ўсіх супярэчнасцей. Перыяд паміж сусветнымі войнамі вылучаўся палітычнымі і эканамічнымі крызісамі ў краінах Захаду, ростам таталітарных рэжымаў і падрыхтоўкай да Другой сусветнай вайны. Найважнейшым фактарам геапалітычнай сітуацыі ў свеце выступілі Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя ў Расіі і стварэнне Савецкай дзяржавы.

Другая сусветная вайна і пасляваенны свет

Другая сусветная вайна (1939–1945) была самым маштабным канфліктам у гісторыі, у якім удзельнічала большасць краін свету. Перамога антыгітлераўскай кааліцыі адкрыла новую хпоху, а створаная Арганізацыя Аб'яднаных Нацый ператварылася ў сімвал імкнення да падтрымання міжнароднага міру і стабільнасці. Аднак неўзабаве пачалася *«халодная вайна»* — супрацьстаянне СССР і ЗША, якое падзяліла свет на два блокі.




*Паштоўка СССР*

Другая палова XX ст.: «халодная вайна» і працэсы дэкаланізацыі

«Халодная вайна» (1946–1991) вызначыла міжнародныя адносіны амаль на паўстагоддзя. СССР і ЗША спаборнічалі ў ваеннай, эканамічнай, ідэалагічнай і навуковай сферах. Сусвет стаў перад пагрозай ядзернага канфлікту, але адначасова развіваліся міжнародныя інстытуты супрацоўніцтва. У гэтыя ж дзесяцігоддзі адбывалася дэкаланізацыя: дзясяткі краін Азіі і Афрыкі атрымалі незалежнасць, што змяніла палітычную карту свету і ўзмацніла значэнне дзяржаў, якія развіваюцца.

Канец XX ст.: распад біпалярнай сістэмы

Напрыканцы 1980-х гг. крызіс сацыялістычнага блока і распад СССР (1991) прывялі да завяршэння «халоднай вайны». Свет уступіў у эпоху аднапаляр-

Успомніце, калі і дзе было падпісана пагадненне аб спыненні існавання СССР.

насці пад лідарствам ЗША. Адначасова ўзмацняліся працэсы глабалізацыі: развіццё інфармацыйных тэхналогій, міжнароднага гандлю і інтэграцыі. Еўрапейскі саюз ператварыўся ў новы цэнтр сілы. Кітай пачаў імклівы эканамічны рост.

Першая чвэрць XXI ст.: новыя выклікі і шматпалярнасць

Пачатак XXI ст. адзначыўся змяненнем структуры сусветнай палітыкі. ЗША захоўвалі вядучыя пазіцыі, але адначасова ўзмацніліся Кітай, Індыя, краіны Еўрапейскага саюза, Расія. Свет зрабіўся шматпалярным, што зрабіла міжнародныя адносіны больш складанымі і канфліктнымі. Новымі выклікамі былі тэрарызм, экалагічныя праблемы, энергетычная бяспека, пандэміі. Міжнародныя арганізацыі, такія як ААН, ЕС, ШАС, НАТО, адыгрываюць важную ролю, але не заўсёды здольныя прадухіляць канфлікты.

Беларусь у сусветным геапалітычным кантэксце: агульная характарыстыка

Тэрыторыя Беларусі на працягу XIX–XXI стст. увесь час была ў сферы буйны́х геапалітычных працэсаў. У XIX ст. гэтыя землі ўваходзілі ў склад Расійскай імперыі і ўдзельнічалі ў яе міжнароднай палітыцы. У XX ст. Беларусь трапіла ў цэнтр сусветных вой
і адначасова зрабіла значны ўнёсак у Перамогу. ў міжнародных арганізацыях як саюзная рэспубліка СССР. Ад 1991 г. незалежная Беларусь выбудоўвае ўласную знешнюю палітыку, абапіраючыся на сваё стратэгічнае становішча паміж Усходам і Захадам.

Такім чынам, геапалітычныя працэсы XIX — першай чвэрці XXI ст. вызначалі не толькі лёсы вялікіх дзяржаў, але і развіццё Беларусі. Разуменне гэтых працэсаў дазваляе асэнсаваць месца краіны ў сусветнай гісторыі і яе ролю ў сучасным свеце.

Геапалітычнае становішча Беларусі

**7. Асаблівасці геапалітычнага становішча Беларусі.** Геапалітычнае становішча дзяржавы вызначаецца яе месцазнаходжаннем на карце, суседзя-

мі, прыроднымі рэсурсамі і шляхамі зносін. Для Беларусі гэтае становішча заўсёды мела ключавое значэнне: краіна знаходзіцца ў цэнтры Еўропы, на скрыжаванні найважнейшых гандлёвых і вайсковых шляхоў паміж Усходам і Захадам, Поўначчу і Поўднем. Такое становішча адначасова адкрывала магчымасці для развіцця і стварала пагрозы, бо Беларусь часцяком рабілася арэнай міжнародных сутыкненняў.

Успомніце, якія гандлёвыя шляхі праходзілі па тэрыторыі сучаснай Беларусі ў старажытнасці і Сярэднявеччы.

### XIX ст.: Беларусь у складзе Расійскай імперыі

У XIX ст. беларускія землі ўваходзілі ў склад Расійскай імперыі і мелі прыгранічнае значэнне. Праз іх праходзілі шляхі, якія злучалі Пецярбург і Маскву з Варшавай, Берлінам і Венай. Ваенна-стратэгічная роля рэгіёна ўзмацнілася пасля напалеонаўскіх войнаў: заходнія губерні разглядаліся як фарпост Расіі на мяжы з Еўропай. Адначасова суседства з Польшчай, дзе актыўна пашыраўся нацыянальны рух, спрыяла росту цікавасці да нацыянальнай культуры і самасвядомасці беларусаў.



*Аляксандраўская чыгунка. Станцыя Мінск. 1914 г.*

### Пачатак XX ст.: войны і падзелы

Геапалітычнае становішча Беларусі надзвычай яскрава праявілася ў гады сусветных войнаў. Першая сусветная вайна прынесла на яе землі жорсткія баі



*Сустрэча РСЧА. Заходняя Беларусь. 1939 г.*

паміж германскімі і расійскімі войскамі. Пасля рэвалюцыі 1917 г. і распаду імперый Беларусь аказалася аб'ектам тэрытарыяльных спрэчак: частка яе зямель увайшла ў склад Польшчы, іншая — у склад БССР. Уз'яднанне падзеленых тэрыторый здзейснілася ў 1939 г. у выніку вызваленчага паходу Чырвонай арміі.

### Другая сусветная вайна і Вялікая Айчынная вайна

Успомніце, якія страты зазнала Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны.

Стратэгічнае знаходжанне Беларусі паміж Германіяй і СССР зрабіла яе адным з галоўных тэатраў ваенных дзеянняў. Ужо ў першыя тыдні вайны тэрыторыя рэспублікі была акупаваная, а насельніцтва зазнала катастрафічныя ахвяры. Беларусь апынулася ў цэнтры барацьбы сусветных дзяржаў, а яе партызанскі рух адыграў значную ролю ў выніку вайны. Гэтая трагічная старонка гісторыі назаўсёды падкрэсліла ўразлівасць краіны перад геапалітычнымі выклікамі.

### У гады «халоднай вайны»



*К. Кісялёў падпісвае Статут ААН 26 чэрвеня 1945 г.*

Пасля 1945 г. Беларусь як частка СССР зноў набыла асаблівае значэнне. Яна знаходзілася на заходняй мяжы Савецкага Саюза, і яе тэрыторыя разглядалася як «ваенна-стратэгічны шчыт». Тут размяшчаліся вялікія вайсковыя згуртаванні, будаваліся транспартныя калідоры, што злучалі СССР з Усходняй Еўропай. Адначасова з гэтым БССР, выступаючы як саюзная рэспубліка, атрымала права ўдзельнічаць у міжнародных арганізацыях: ад 1945 г. яна была членам-заснавальнікам ААН. Гэта падкрэслівала асаблівую ролю Беларусі ў міжнародных адносінах.

### Рэспубліка Беларусь

Успомніце, у склад якіх міждзяржаўных аб'яднанняў уваходзіць Рэспубліка Беларусь.

Пасля распаду СССР незалежная Беларусь успадчыла важнае геапалітычнае становішча на стыку Захаду і Усходу. Краіна мае агульную мяжу з пяццю дзяржавамі — Расіяй, Украінай, Польшчай, Літвой і Латвіяй. Такое становішча вызначае яе як «мост» паміж Еўрапейскім саюзам і постсавецкай прасторай. Беларусь удзельнічае ў інтэграцыйных працэсах з Расіяй і іншымі краінамі СНД, адначасова падтрымлівае кантакты з ЕС і міжнароднымі арганізацыямі.

Геапалітычная спецыфіка Беларусі праяўляецца таксама ў галіне эканомікі і камунікацый. Па яе тэрыторыі праходзяць важныя транспартныя калідоры: чыгункі і аўтамагістралі, што злучаюць Расію з Еўропай, а таксама нафтагазаправоды, якія забяспечваюць транзіт энергарэсурсаў. Гэта робіць краіну значным удзельнікам рэгіянальнай і сусветнай эканомікі.

Сучасныя выклікі

У XXI ст. геаграфічнае становішча Беларусі застаецца фактарам як магчымасцей, так і выклікаў. З аднаго боку, краіна можа выкарыстаць сваё размяшчэнне для развіцця супрацоўніцтва і гандлю, умацавання ролі транзітнага цэнтра. З іншага — абвастрэнне адносін паміж Расіяй і Захадам узмацняе ціск на Беларусь, ператварае яе ў зону канкурэнцыі інтарэсаў вялікіх дзяржаў. У гэтых умовах асаблівае значэнне набывае здольнасць дзяржавы праводзіць узважаную знешнюю палітыку і захоўваць устойлівасць.

Такім чынам, геапалітычнае становішча Беларусі ў XIX — першай чвэрці XXI ст. вызначала яе гістарычны лёс. Знаходзячыся на скрыжаванні Усходу і Захаду, Беларусь часцяком рабілася арэнай ваенных дзеянняў і міжнародных супярэчнасцей, але адначасова захоўвала патэнцыял быць злучальным звяном паміж рознымі цывілізацыямі і палітычнымі сістэмамі. Усведамленне гэтай спецыфікі дапамагае зразумець як мінуўшчыну краіны, так і яе ролю ў сучасным свеце.

**ПЫТАННІ І ЗАДАННІ**

1. Дакажыце з дапамогай канкрэтных прыкладаў, што гісторыя з'яўляецца найважнейшым інструментам асэнсавання сучаснага свету і месца ў ім кожнага чалавека.
2. У чым значэнне метаду перыядызацыі для вывучэння гісторыі?
3. Дайце кароткую характарыстыку асноўных геапалітычных працэсаў у свеце на кожным этапе XIX — першай чвэрці XXI ст. Растлумачце крытэрыі вылучэння менавіта гэтых этапаў гістарычнага развіцця.
4. Растлумачце, як геапалітычнае становішча Беларусі вызначыла яе гістарычны лёс у XIX — першай чвэрці XXI ст.